УДК 408.53(476)

**Ю.М. Бабіч, С. М. Маскаленка**

# Каларонімы ў паэтычных творах Янкі Купалы і Максіма Багдановіча

Адной з прыярытэтных у сучаснай беларускай лінгвістыцы з'яўляецца праблема мовы мастацкага тэксту. Мастацкая мова (асабліва мова твораў класічнай літаратуры) нясе ў сабе адбітак эпохі, у якую жыве пісьменнік, асаблівасці аўтарскага светаразумення і светаўспрымання. «Псіхалагічны

аспект успрымання чалавекам колеру звязаны з культурнымі, светапоглядным, эстэтычнымі традыцыямі асяроддзя, у якім вырас і сфарміраваўся чалавек, з яго мінулым досведам, памяццю, асацыятыўным характарам мыслення» [1], – заўважае Я. Панамарова. У гэтым сэнсе надзвычай істотную ролю адыгрывае каларыстычная лексіка.

Спецыфіка выкарыстання канкрэтным аўтарам каларонімаў выразна выяўляецца пры супастаўляльным аналізе. Багаты матэрыял для гэтага даюць паэтычныя творы Янкі Купалы і Максіма Багдановіча, у прыватнасці, зборнікі «Жалейка» і «Вянок».

Усе адзначаныя ў зборніках пісьменнікаў каларонімы неабходна разглядаць у межах пэўных колеракодаў. Вызначэнне колькасці колеракодаў грунтуецца на аснове тэорыі Э. Герынга пра NCS – сістэму натуральных колераў. Яе сутнасць у распазнанні «шасці **псіхалагічна першасных колераў**: белага, чорнага, жоўтага, чырвонага, сіняга і зялёнага. Апошнія чатыры колеры з'яўляюцца унітарнымі колеравымі тонамі. Усе астатнія колеравыя тоны ацэньваюцца як сумесь двух унітарных тонаў» [2]. Сумесь белага і чорнага колераў выдзелім у колеракод «шэры». У асобную групу вылучаецца лексіка са значэннем шматфарбнасці.

У працэсе кантрастыўнага аналізу мэтазгодна акцэнтаваць увагу і на няўласных якасцях колеру (аптычнай і тэрмічнай семах), а галоўнае – на колеравым сімвалізме, бо ён разглядаецца «як вынік сацыяльнага, біялагічнага, псіхалагічнага досведу» [1], і, такім чынам, дае дастаткова поўную інфармацыю для параўнання колеравай семантыкі. Сімвалічнае значэнне, у сваю чаргу, выяўляецца ў ходзе даследавання вертыкальнага кантэксту.

Істотнае адрозненне выкарыстання каларыстычнай лексікі Багдановічам заключаецца ў наяўнасці большай колькасці і разнастайнасці колераэлементаў у параўнанні з творамі Купалы. Вершы Максіма Багдановіча пераважна пейзажныя, і гэта вымагае стварэння вобразных, яскравых, па-мастацку прыгожых малюнкаў, а вершы Янкі Купалы часцей сюжэтныя.

Максім Багдановіч пашырае выяўленчы патэнцыял каларонімаў пры ўжыванні кампазітаў, большасць якіх адной з частак мае лексему са значэннем чырвонага колеру: **ярка-чырвоны, жоўта-чырвоны** і інш.: *Досі ўжо працы, бо сонца зайшло! <u>Ярка-чырвоныя</u>, жоўтыя, бурыя Боразны ў небе яно правяло. («Досі ўжо працы»).*

Кампазіты-прыметнікі спалучаюцца ў асноўным з назоўнікамі, якія ілюструюць нябесныя стыхіі, што можа быць растлумачана рамантычным светапоглядам паэта.

Намі заўважана і спецыфічная група складаных прыметнікаў, першая частка якіх – назва колеру, а другая – назва частак цела жывых істот: **жаўтадзюбы, сінякрылы, сівавусы, сінявокі:** *Ціха па мяккай траве <u>Сінявокая</u> ноч прахадзіла... («Ціха па мяккай траве...»). <u>Сівавусы</u>, згорблены, я залёг між цінай І гадамі грэюся – сплю на дне ракі. («Вадзянік»).*

У Янкі Купалы ў зборніку «Жалейка» падобныя колеравыя адзінкі адсутнічаюць.

У вершах Максіма Багдановіча і Янкі Купалы вельмі прадуктыўным з'яўляецца колеракод «белы». Калі ў Янкі Купалы ён часцей рэпрэзентаваны чыстым колерам, то ў Максіма Багдановіча колераэлементам «срэбны». Кампаненты кода «белы» часам набываюць тэрмічную сему «**холад**», прычым у Янкі Купалы – толькі праз асацыятыўныя сувязі са з'явамі прыроды: *<u>Халодным срэбрам</u> ззяюць хвалі Між гор ліючайся ракі... (Максім Багдановіч. «Слуцкія ткачыхі»). Шумныя бярозы <u>Пабяліў мароз</u>... (Янка Купала. «Шумныя бярозы...»).*

У творах абодвух паэтаў белы колер сімвалізуе чысціню, цнатлівасць, але ў пэўных дыстрыбуцыйных умовах можа атаясамлівацца са смерцю. Паводле сцвярджэння І.Крука, белы колер таксама і «сімвал смутку, жалобы, гора... трансфармацыі, пераходу ў іншы стан, сімвал дарогі з аднаго свету ў іншы. У міфалагічным сэнсе слова – гэта сімвал бязмежнасці, вечнасці сусвету» [3]. Пры пераходзе, трансфармацыі, натуральна, адбываецца і ачышчэнне. Такім чынам праяўляецца амбівалентнасць белага колеру: *Белы крыж, пліта, пад ёй магіла; Мілым кветам рожа зацвіла. (Максім Багдановіч. «Белы крыж, пліта, пад ёй магіла...»). Снег белы мёртва сцелецца Пасцеляй грабавой... (Янка Купала. «Зіма»).*

У традыцыйнай культуры беларусаў замацавалася бінарная апазіцыя белага і чырвонага колераў як супрацьпастаўленне жыцця і смерці. Выразна гэта адлюстравана ў наступным вершы Максіма Багдановіча: *Без сіл, уся ў пату, як белы снег, блядна, На зліταю крывёй і змятай караваці Ляжыць шчаслівая і жалкая яна, І аб адным у ёй цяпер дума: «Я – маці». Яна збалела ўся. Ёй, можа, ўжо не жыць. І ўсё ж ткі радасцю бязмежай ззяюць вочы, А на яе тугіх грудзях ужо ляжыць Чырвоны, цёпленькі і неяк смешна смокча. («Без сіл, уся ў пату, як белы снег, блядна...»).*

Тут сімволіка колераў падкрэслівае ідэю верша: праз смерць сцвярджаецца жыццё. Белы колер сімвалізуе блізкасць да смерці, а таксама пераход у новы стан – стан жанчыны-маці, чысціню, святасць гэтай падзеі; чырвоны сімвалізуе новае жыццё, дзіця.

Адну з улюбёных з'яў – захад сонца – паэт таксама фарбуе ў чырвоны колер. Сонца ў фальклоры славян традыцыйна ўспрымаецца як сімвал жыцця.

У адрозненне ад Максіма Багдановіча, у Янкі Купалы чырвоны колер – сімвал гора, адмоўных пачуццяў чалавека. Такая сімволіка, напэўна, асацыятыўнага паходжання, суадносіцца з колерам крыві, пралітай гвалтам, у барацьбе. Яна мае адмоўную канатацыю. Красамоўным пацверджаннем з'яўляецца колераэлемент «крывавы»: *Гарыць пуня панская, бухае пламем; Крывавым на небе становіцца знамем. (Янка Купала. «Адплата кахання»). Рэжа сэрца мне горай касы Зменнасць, хітрасць агністых вачэй! (Янка Купала. «Чаго б я хацеў»).*

Што датычыцца тэрмічнай афарбоўкі, то толькі колераэлементы кода «чырвоны» у паэтычных творах абодвух паэтаў набываюць сему «**цяпло**». Дарэчы, у зборніку «Жалейка» Янкі Купалы і ў большасці выпадкаў у зборніку «Вянок» Максіма Багдановіча – праз асацыятыўную сувязь з агнём: Я ведаю, што там агонь гарыць пад ёю, *Я ведаю, што там чырвоны жар гарыць. (Максім Багдановіч. «Халоднай ноччу ў шырокім, цёмным полі...»). Агніста сонца прыпякае, У губах язык засох, як косць... (Янка Купала. «Песня жнеяў»).*

Каларонімы кода «чорны» і ў мове Багдановіча, і ў мове Купалы характарызуюць амаральныя якасці чалавека, заняпад, нядолю, адпаведна маюць адмоўную канатацыю. У Максіма Багдановіча «чорны» – яшчэ і сімвал таямніцы, невядомасці: *Ужо імгла над зямлёю лажыцца, Чорнай рызай усё пакрывае, Пылам зор небасхіл абсявае. (Максім Багдановіч: «Добрай ночы, зара-зараніца...»). Віднеліся ў сцянах сляпыя вокны іх, І аж чарнелася салома стрэх гнілых. (Максім Багдановіч. «У вёсцы»). Толькі чорная нядоля Сунецца, плыве... (Янка Купала. «З пралётных думак»). Так чорныя думы адна за другою Снуюцца ў тырана... (Янка Купала. «Адплата кахання»).*

*У Янкі Купалы каларонімы кода «чорны» ужываюцца ў пераносным значэнні і выкарыстоўваюцца як сталыя эпітэты, якія захоўваюць цесную сувязь з фальклорам, на што ўказваюць сцягнутыя формы прыметнікаў. Няўласныя якасці гэтага колеру ў зборніку выразна не праяўляюцца.*

Сімвалічнае значэнне сіняга колеру ў паэтаў не супадае. У Багдановіча ён выкарыстоўваецца пераважна пры апісанні зор, месяца і наогул ночы, з'яўляецца сімвалам ціхага і спакойнага смутку, узвышанай таямніцы прыроды. У Купалы сіні колер – сімвал хваравітасці, безнадзейнасці: *Сумна плыве маладзік бледна-сіні Ў небе вячэрнім, зялёным, як лёд... (Максім Багдановіч. «Вечар на захадзе ў попеле тушыць...»). Самі ж вы зданямі Беднымі, сінімі Летам усходзіце Па-над магіламі. (Янка Купала. «Над магіламі»).*

Існуе непасрэдная сувязь паміж колерам і эмацыянальным станам чалавека. «Эксперыментальна высветлена, – заўважае А. Зайцаў, – што станоўчы эмацыянальны стан павялічвае адчувальнасць да чырвонага і жоўтага, адмоўны – да сіняга і зялёнага» [4]. Гэта акалічнасць пэўным чынам тлумачыць канатацыю сімволікі сіняга колеру, а таксама ілюструе творчую манеру паэтаў. Толькі ў Максіма Багдановіча сіні колер праз асацыятыўныя сувязі са снегам набывае тэрмічную сему «холад»: *Вільготны месяц стуль на поле Празрысты, светлы стоўп спусціў І рызай срэбнаю раздолле Снягоў сінеючых пакрыў. (Максім Багдановіч. «Зімой»).*

У Максіма Багдановіча сіні колер можа абазначаць і адлегласць да аб'екта: *І лятуць мае лёгкія сані, Унашуся я ў сінюю даль. (Максім Багдановіч. «Зімовая дарога»).* Наяўнасць калароніма «**сіні**» побач з назоўнікам «**даль**» невыпадковая. Гэта звязана з пэўнымі фізічнымі ўласцівасцямі паветра ў прыродзе: «аддаленыя часткі ландшафта ўдзень падаюцца ў паўпразрыстым блакітным тумане. Калі паветра дастаткова чыстае, то смуга мае насычаныя сінія тоны; адсюль часта ўжывальны ў літаратуры выраз «сінія далі» [5].

Сімволіка зялёнага колеру ў паэтаў кардынальна процілеглая: у Купалы – гэта перамога жыцця, увасобленая ў прыродзе, а ў Багдановіча – холад, сум: *Лясы ўжо шумелі, дзярны зелянелі. І пекна і міла было ўсё ўкруг. (Янка Купала. «Канюх»). Як моцны рэактыў, каторы выклікае Між строк ліста, маўляў нябожчыкаў з магіл, Рад раньш нявідных слоў, – так цемень залівае Зялёны, быццам лёд, халодны небасхіл... (Максім Багдановіч. «Актава»).* У адрозненне ад Купалы, у Багдановіча зялёны колер мае ўстойлівую сему «холад».

Жоўты колер у паэтычнай мове Янкі Купалы адсутнічае, а ў Максіма Багдановіча рэпрэзентаваны ў большасці не чыстым колерам, а пераважна колераэлементам «залаты», які часта ўжываецца пры апісанні месяца і зор: *Уюцца змейкай срабрыстай дарожкі, Брызгі золата ў небе блішчаць, І маркотныя месяца рожкі Праз марозную мглу зіхацяць. (Максім Багдановіч. «Зімовая дарога»).*

Заўважым, што Максім Багдановіч вельмі прадуктыўна карыстаецца «металічнымі» залатой і срэбнай фарбамі, якія з'яўляюцца сімвалам пэўнай ірэальнай прыгажосці, казачнасці. Гэтымі колерамі ствараюцца фантасмагарычныя малюнкі ночы.

Шэры колер і ў Багдановіча, і ў Купалы сімвалізуе страту радасці, нуду, абыякавасць. Такая сімволіка ўзыходзіць да пераноснага значэння лексемы «шэры» – «пасрэдны», «нецікавы»: *Хай чарада гадзін панурых, нудных, шэрых Як попел на душу мне клалася ўвесь час... (Максім Багдановіч. «Халоднай ноччу ў шырокім, цёмным полі...»). Ці з поля гадзінкаю шэрай Вярнуся, сяджу за сталом... (Янка Купала. «Адзін»).*

Да групы лексікі са значэннем шматфарбнасці адносяцца лексемы, семантыка якіх аб'ядноўвае некалькі колераў адразу: *... усякімі цвятамі, Рознакалёрнымі галоўкамі звяроў Ён пакрашае скрозь – даволі ёсць знароўкі – Свае шматфарбныя застаўкі і канцоўкі... (Максім Багдановіч. «Перапісчык»). Ва ўсіх шчасце на твары вясёлкай гуляе. (Янка Купала. «Засвяціла цяпло бляскам радасці яснай...»).* У апошняй дыстрыбуцыі каларонім, ужыты ў пераносным значэнні, перадае шматграннасць пачуцця.

Тры найбольш прадуктыўныя колеракоды ў паэтычных творах зборніка «Вянок» Максіма Багдановіча – белы (40), жоўты (21), сіні (20). Заўважым, што колеракод «жоўты» рэпрэзентаваны ў асноўным колераэлементам «залаты», а сярод колераэлементаў кода «сіні» трэцюю частку складаюць лексемы, якія абазначаюць невялікую насычанасць колеру (сіняваты, бледна-сіні).

Янка Купала ў зборніку "Жалейка" аддае перавагу коларонімам кодаў «чорны» (17) і «белы» (16), «чырвоны» (9) і «зялёны» (9). Гэтыя пары колераў паводле законаў каларыстыкі з'яўляюцца кантрастнымі. Іх палярызацыю падкрэслівае сімволіка: гэта процістаянне ліха і дабра, цемры і святла.

Такім чынам, колеравая лексіка не толькі стварае ёмістыя зрокавыя вобразы і павышае выяўленчыя магчымасці твораў, але і набліжае нас да разумення думкі аўтара, яго светапогляду, псіхалагічнага стану ў пэўны перыяд жыцця, эстэтычных густаў. Так, адсутнасць яркіх фарбаў, схільнасць да фантасмагарычнасці ў вершах Максіма Багдановіча суѓучныя трагічнаму лёсу паэта, збалелай душы, якая апошнімі сіламі імкнулася спасцігнуць таямніцу жыцця. Кантрастнасць жа ва ўспрыманні Янкі Купалы бліжэй да традыцыйнага народнага светапогляду. Супрацьпастаўленнем, магчыма, паэт імкнуўся вырашыць унутраныя супярэчнасці, бо ў «Жалейцы» сцвярджаецца «прынцып двайнога ўспрымання рэчаіснасці: з аднаго боку рэалістычна-дакладнае ўзнаўленне жыцця, з другога – асэнсаванне яго ў рамантыка-абагульненых вобразах-сімвалах» [6].

І ў Максіма Багдановіча, і ў Янкі Купалы аднымі з прыярытэтных выступаюць ахраматычныя колеры – белы і чорны. Гэта з'яўляецца доказам таго, што, ужываючы ў вертыкальным кантэксце каларонімы семантычна супрацьлеглых кодаў, пісьменнікі абіраюць кантраст як найбольш удалы метад для адлюстравання сутнасці з'яў жыцця. Такім чынам праяўляецца і асаблівасць рамантычнага светаўспрымання творцаў. У астатнім жа колеравыя палітры паэтаў значна розняцца, бо кожны адпаведна са сваім своеасаблівым бачаннем малюе непаўторную карціну рэчаіснасці.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Пономарёва Е.С.*** Цвет в интерьере. Мн., 1984. С. 8, 10.
2. ***Агостон Ж.*** Теория цвета и ее применение в искусстве и дизайне. М., 1982. С. 133.
3. ***Крук І.*** Сімволіка колераў у традыцыйнай культуры беларусаў // Роднае слова. 1997. №1. С. 150.
4. ***Зайцев А.*** Наука о цвете и живопись. М. 1986. С. 83.
5. ***Шаронов В.В.*** Свет и цвет. М. 1961. С. 273.
6. ***Бярозкін Р.*** Свет Купалы: Звенні: Літаратурная крытыка. Выбранае. Мінск. 1981. С. 237.



## SUMMARY

*The article consider the problems of the lexical colouristics. Conduct the comparative analysis of the lexical colouristics by Maksim Bogdanovich and Yanka Kupala. Attention is accented on the symbol colours, on the not properown qualitys colours (the optical and the thermal).*



*Поступила в редакцию 14.11.1999*